У цэнтры Слоніма затрымалі Паўла Севасцьяна

таму

У нядзелю, 1 лістапада, у цэнтры Слоніма быў затрыманы грамадскі актывіст, сябра Слонімскага згуртавання дэмакратычных сіл **Павел Севасцьян**.



Да яго пад'ехала міліцэйская машына з міліцыянтамі і спынілася. З машыны выйшаў падпалкоўнік міліцыі Вадзім Шчурскі і загадаў прайсці ў міліцэйскую машыну. На пытанне: за што вы мяне затрымліваеце, Шчурскі адказаў: "За тое, што 25 кастрычніка прымаў удзел у Слоніме ў несанкцыянаваным мітынгу каля помніка Льву Сапегу".

Паўла Севасцьяна адвезлі ў міліцэйскі пастарунак, дзе маёр міліцыі Андрэй Гусар склаў пратакол. Праз паўтары гадзіны слонімца адпусцілі. Цяпер, відаць, адбудзецца суд, дзе Паўла Севасцьяна пакараюць штрафам.

Беларускае Радыё Рацыя

Facebook (https://www.facebook.com/sharer/sharer.php?u=https%3A%2F%2Fwww.racyja.com%2Fhramadstva%2Fu-tsentry-slonima-zatrymali-paula-seva%2F&t=%D0%A3+%D1%86%D1%8D%D0%BD%D1%82%D1%80%D1%8B+%D0%A1%D0%BB%D0%BE%D0%BD%D1%96%D0%BC%D0%B0+%D0%B7%D0%B0%D1
Twitter
VKontakte (http://vk.com/share.php?url=https%3A%2F%2Fwww.racyja.com%2Fhramadstva%2Fu-tsentry-slonima-zatrymali-paula-seva%2F&image=https://www.racyja.c
content/uploads/2020/11/IMG_0628.jpg&description=%D0%9F%D0%B0%D1%9E%D0%BB%D0%B0+%D0%A1%D0%B5%D0%B2%D0%B0%D1%81%D1%86%D1%8C%D1%
Odnoklassniki (https://connect.ok.ru/offer?url=https%3A%2F%2Fwww.racyja.com%2Fhramadstva%2Fu-tsentry-slonima-zatrymali-paula-seva%2F&title=%D0%A3+%D1%86%D1%8D%D0%BD%D1%82%D1%80%D1%8B+%D0%A1%D0%BB%D0%BE%D0%BD%D1%96%D0%BC%D0%B0+%D0%B7%D0%B0%
content/uploads/2020/11/IMG_0628.jpg)



(/apps/)